**У. В. Здановіч**

# ШТОДЗЁННАЕ ЖЫЦЦЁ ГАРАДСКІХ І СЕЛЬСКІХ ЖЫХАРОЎ БЕЛАРУСІ ПАДЧАС НАЦЫСЦКАЙ АКУПАЦЫІ Ў АЦЭНКАХ БЕЛАРУСКІХ ДАСЛЕДЧЫКАЎ

Нацысцкая акупацыя Беларусі, якая працягвалася з 22 чэрвеня 1941 г. па 28 ліпеня 1944 г. мела для рэспублікі катастрафічныя наступствы. Праз існаванне ў населеных пунктах ваенных камендатур, паліцэйскіх гарнізонаў, раённых і гарадскіх упраў усталявалася сістэма непасрэднага кантакту жыхароў з акупацыйнымі ўладамі. Сацыяльна-эканамічнае і прававое становішча шматмільённага насельніцтва рэзка памянялася. Аднак нягледзячы на тое, што палітыка акупантаў мела шматвектарны характар і закранала эканоміку, адукацыю, ахову здароўя, культуру і рэлігію, праблема паўсядзённасці не стала прыярытэтным накірункам у даследаваннях гісторыкаў савецкага перыяду. У значнай ступені такая сітуацыя была выклікана партыйнымі ўстаноўкамі, згодна з якімі жыццё розных катэгорый насельніцтва на акупаванай тэрыторыі разглядалася як штодзённае змаганне з ворагам. Найбольш яскрава дадзены падыход знайшоў адлюстраванне у манаграфіях «Быт беларускіх сялян у партызанскім краі» [1], «В партизанских краях и зонах [2] і доктарскай дысертацыі А. І. Залескага [3]. Адступленне ад традыцыйнага разгляду паводзінаў грамадзян толькі як гераічных супраціву акупацыйнаму рэжыму было немагчыма, любыя іншыя факты ставілі пад сумненне існаванне савецкай дзяржавы, падтрымліваемай усім народам.

У пачатку 1990-х гг. пачаўся новы, беларускі перыяд айчыннай гістарыяграфіі, адной з асаблівасцяў якога стала станаўленне напрамкаў даследаванняў, якія ў савецкія часы па розных прычынах заставаліся па-за ўвагай даследчыкаў. Адным з іх стала гісторыя паўсядзённаці на акупаванай нацыстамі тэрыторыі. Аднак па ступені распрацаванасці тэма саступае ўзроўню вывучанасці праблемы расійскамі даследчыкамі, багаж якіх уключае працы як па гісторыі штодзённасці ваеннага часу агульнарасійскага характару, так і напісаныя на рэгіянальным матэрыяле. Тым не меньш, і ў беларускіх гісторыкаў маюцца пэўныя напрацоўкі. Так, праблема штодзённага жыцця гарадскіх і сельскіх жыхароў Беларусі ў час акупацыі знайшла адлюстраванне ў калектыўнай працы «Беларусь в годы Великой Отечественной войны”. У адрозненне ад гісторыкаў савецкага перыяду, якія асноўную ўвагу надавалі паказу барацьбы з акупантамі, аўтары, характарызуючы становішча сельскага насельніцтва, падкрэсліваюць, што з аднаго боку, «жыхары беларускіх рэгіёнаў, знаходзячыся пад кантролем акупантаў, у такой абстаноўцы, натуральна, імкнуліся выжыць, хоць нейкім чынам забяспечыць неабходныя сродкі для існавання сваіх сем’яў. Гэта ў многіх выпадках прымушала падпарадкоўвацца патрабаванням заваёўнікаў, працаваць на іх, выплочваць падаткі, выконваць пастаўкі і г.д.» [4, с. 325]. З другога боку, «масавым было і непадпарадкаванне, сабатаж, якія перарасталі ў самых розных месцах Беларусі ў адкрытую барацьбу з ворагам».

Разгорнутая характарыстыка паўсядзённага жыцця жыхароў Беларусі ва ўмовах германскай акупацыі дадзена Я. А. Грэбенем у манаграфіі «Гражданское население Беларуси в условиях немецкой оккупации (1941–1944 гг.)», якая ўбачыла свет у 2016 годзе. «Вынікам нацысцкай акупацыі, – канстатуе аўтар, – стала рэзкае пагаршэнне матэрыяльнага становішча пераважнай большасці грамадзян. Не хапала самага неабходнага для жыцця. Праблемай стала не толькі харчаванне, але і адзенне, абутак, соль і іншыя прадметы першай неабходнасці ... Дадатковым фактарам, які ўплываў на матэрыяльнае становішча грамадзян, стала эксплуатацыя немцамі іх матэрыяльных рэсурсаў ... Вымушанае існаваць з новай уладай, большасць людзей у адносінах да яе прыстасоўвалася, але не прызнавала сваёй, не лічыла для сябе ганебным гэтую ўладу падманваць ... Прыстасоўваючыся да сітуацыі, грамадзяне ўхіляліся ад выплаты падаткаў або імкнуліся іх мінімізаваць, праводзілі махінацыі з карткамі, ўхіляліся ад павіннасцяў, каб захаваць сілы для выжывання ... Акрамя фізічнага знішчэння, грамадзянскае насельніцтва Беларусі сутыкнулася з рэальнай пагрозай смерці на фоне экстрэмальных сацыяльна-эканамічных умоў. Наступствы такога расцягнутага ў часе генацыду выяўляліся паступова, але цалкам адпавядалі духу генеральнага плана “Ост”. Подзвігам з’яўлялася само жыццё ва ўмовах акупацыі, паколькі захаваць яго, выжыць дзеля будучыні было вельмі складана» [5, с. 222, 491, 492, 493].

Жыццё гарадскіх і сельскіх жыхароў Беларусі на акупаванай тэрыторыі разгледжана ў асобным параграфе «Жыццё насельніцтва ў гады акуапацыі» 6-томнай «Гісторыі Беларусі». Уведзеныя ў навуковы абарот У. І. Кузьменка новыя дакументы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь пацвярджаюць выснову іншых даследчыкаў аб тым, што паўсядзённае жыццё чалавека ва ўмовах акупацыі было б дакладней назваць «выжыванне». «Матэрыяльнае становішча, жыццёвы ўзровень насельніцтва, – піша гісторык, – вельмі невысокі і перад вайной, рэзка знізіўся на працягу трох гадоў фашысцкай акупацыі. Ва ўмовах пастаяннага падатковага прэса захопнікаў, фактычнага рабавання сельскае насельніцтва было вельмі хутка пастаўлена на грань поўнай галечы ... Яшчэ горшым было становішча жыхароў гарадоў. Нават тыя, хто працаваў, існаваў паўгалодным ... Галодных людзей акупанты прымушалі працаваць па 16–18 гадзін у суткі. Нярэдкія выпадкі, калі знясіленыя працоўныя без прытомнасці падаюць каля станкоў ... Разруха, голад, праследаванні акупантаў гналі людзей з горада ў вёску. Разам з стратамі ад фашысцкага генацыду, угону ў Нямеччыну, а таксама з эвакуацыяй і мабілізацыяй ў воінскія адзінкі гэта з’явілася прычынай таго, што да лета 1944 г. у Віцебскай вобласці засталося 27 %, у Палескай – 29 %, у Магілёўскай – 35 % даваеннага гарадскога насельніцтва» [6, с. 522, 523].

Выснову пра тое, што чалавек ва ўмовах акупацыі не жыў, а выжываў, падтрымлівае і З. Шыбека. Пры гэтым ён лічыць, што сітуацыя на захадзе Беларусі істотна адрознівалася ад сітуацыі на ўсходзе. «Сяляне-заходнікі пры маўклівай згодзе новых гаспадароў распусцілі нешматлікія калгасы і вярнуліся да індывідуальнага гаспадаранню ... На ўсходзе пасля бальшавіцкіх і на-

цысцкіх рэквізіцый людзі жылі пад пагрозай голаду, асабліва ў гарадах ... Захоўваліся калгасы. За найменшую сімпатыю да Чырвонай Арміі і савецкай улады людзей штрафавалі, катавалі, і нават вешалі або забівалі» [7, с. 314, 315]. Асабліва сітуацыя пагоршылася ў 1943 г. «Гарады, адзначае аўтар, – нагадвалі канцэнтрацыйныя лагеры, асабліва ў прыфрантавой паласе ... Працаваць на ваенных прадпрыемствах прыходзілася па 14–15 гадзін у суткі. А заробкі былі ў чатыры-шэсць разоў ніжэй, чым у працоўных з Германіі. У Мінску дзённага заробку хапала на кілаграм бульбы» [Там жа]. Становішча ў вёсцы было значна лепш. Як адзначае З. Шыбека, новыя гаспадары былі зацікаўлены ў наладжванні сельскагаспадарчай вытворчасці на патрэбы фронту. Сялянскія сем'і атрымлівалі ва ўласнасць да гектара пад сядзібу і да сямі гектараў палявой зямлі ў часовае карыстанне. Ім дазвалялася мець неабмежаваную колькасць хатніх жывёл, што пры савецкай уладзе забаранялася. Каб падтрымаць збяднелых сялян ўсходняй Беларусі, немцы летам 1942 г. забяспечвалі іх пасяўным матэрыялам, прывозілі з Германіі плугі, рамантавалі трактары, давалі коней [7, с. 318]. Ствараецца ўражанне, што нацысты з'яўляюцца сапраўднымі выратавальнікамі беларускага сялянства, а іх асноўнай мэтай была клопат аб паляпшэнні становішча жыхароў беларускай вёскі. Але, як піша сам аўтар, сапраўднай мэтай акупантаў было забеспячэнне ўсім неабходным нямецкай арміі.

Пры аналізе акупацыйнага рэжыму нельга абыйсці ўвагай працы Ю. Туронка і Б. К'яры. Так, польскі даследчык, раскрываючы структуру, асноўныя накірункі дзейнасці найбольш значных ваенных фарміраванняў і грамадзянскіх органаў улады у розныя перыяды акупацыі (вайсковае, цывільнае праўленне), не абыходзіць увагай і карныя акцыі захопнікаў. Вызначаючы прычыны такой палітыкі акупантаў у дачыненні да мясцовага насельніцтва, Ю. Туронак піша: «на тэрыторыях дзе не былі занатаваны выступленні партызан, не назіралася "барацьбы з насельніцтвам"» [8, с. 124]. Атрымліваецца, што карная палітыка не з'яўлялася часткай агульнай палітыкі германскага нацызму на акупаваных тэрыторыях, а была адказам на дзеянні партызанскіх сіл. Такім чынам, адказнасць за злачынныя дзеянні акупантаў па сутнасці перакладваецца на партызан, у склад якіх, дарэчы, уваходзілі і мясцовыя жыхары. Аднак, як справядліва адзначае беларускі гісторык А. М. Літвін «з гэтым, відаць, можна пагадзіцца толькі пры адной умове: калі не лічыць за беларускае насельніцтва яўрэяў, цыган, палякаў, беларусаў, рускіх і інш. нац. – камуністаў, камсамольцаў, палітрукоў, былых савецкіх актывістаў – барацьба з імі вялася з першых дзён і і не спынілася б да поўнага іх знішчэння» [8, с. 124].

Цікавай уяўляецца ацэнка жыцця гарадскіх і сельскіх жыхароў Беларусі ў гады нацысцкай акупацыі, дадзеная нямецкім гісторыкам Б. К'яры. «Дыяпазон мясцовых рэакцый на нямецкае панаванне на ўсёй акупаванай тэрыторыі Савецкага Саюза распасціраўся ад бескампраміснага супраціву да інтэнсіўнай падтрымкі. Акупаваныя тэрыторыі ў цені нямецкага тэрору жылі сваім жыццём, якое ў розных рэгіёнах істотна адрознівалася паміж сабой ... Беларусь,

як структурна слабы аграрны раён з адносна нізкімі ўраджаямі, адначасова стала лабараторыяй для ажыццяўлення найгоршай формы нямецкай акупацыйнай палітыкі ... У Беларусі з самага пачатку нямецкай акупацыі дамінантай стала знішчэнне людзей, голад і тэрарыстычная па сваёй сутнасці нямецкая структурная палітыка. А нямецкія службы бяспекі, вермахт і грамадзянская адміністрацыя ў сваім стаўленні да мясцовага насельніцтва не бралі пад увагу ніякіх тактычных разваг. Краіна была жахлівым прыкладам таго, як шчыльна перапляталіся ваенная гаспадарка, сельскагаспадарчая вытворчасць і магчымасці забеспячэння харчавання з мэтай нямецкага ваеннага паходу, расісцкай вайной на знішчэнне» [9, с. 10, 14, 15].

Больш рэльефна ўявіць жыццё насельніцтва ў перыяд акупацыі дазваляе гісторыя асобнага населенага пункта. Так, штодзённасць горада Брэста паказана ў зборніку дакументаў «Брест в 1941–1944 гг. Оккупация. Документы и материалы», падрыхтаваным аўтарскім калектывам у складзе дацэнта кафедры ўсеагульнай гісторыі Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Пушкіна Я. С. Разенблата і супрацоўнікаў Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці А. Г. Карапузавай і Г. Д. Калуставай [10].

Змешчаныя ў раздзеле 3. «Продовольственное обеспечение города» дакументальныя матэрыялы, раскрываюць праблему харчовага забеспячэння горада. З 1 верасня 1941 г. была ўведзена картачная сістэма на хлеб і іншыя харчовыя тавары, уведзены нормы харчовага забеспячэння жыхароў горада. Адзначым, што картачная сістэма мела фіскальны характар і, у першую чаргу, была накіравана на выяўленне асоб, якія ўхіляліся ад працоўнай павіннасці. Цікавасць уяўляюць крытэрыі норм харчовага забеспячэння: «дзеці да 14 гадоў (К. 1/2), звычайны непрацуючы спажывец (Гр. 1), сем'і людзей, якія працуюць у інтарэсах Германіі (Гр. 2), працуючыя ў інтарэсах Германіі (Гр. 3), рабочыя занятыя на асоба цяжкіх работах (Гр. 4)» (с. 133). Лічбы, пададзеныя ў табліцы, паказваюць, што у лепшым становішчы знаходзіліся прадстаўнікі 3 і 4 груп. Да катэгорыі працуючых у інтарэсах Германні адносіліся працаўнікі нямецкіх і мясцовых лясных, харчовых, прамысловых і іншых прадпрыемстваў. У склад 4 групы былі уключаны спецыялісты ваенных прадпрыемстваў і чыгункі, работнікі шахт і каменаломняў [10, с. 129, 133].

У асобым становішчы знаходзіліся яўрэі. Палітыка акупацыйных улад у дачыненні да іх спалучалася рэпрэсіямі з атрыманнем выгады ад працы яўрэяў, якія дамінавалі ў многіх галінах вытворчасці. Аднак, нягледзячы на каштоўнасць яўрэйскіх спецыялістаў, існавалі сур'ёзныя абмежаванні у працы яўрэйскага насельніцтва і яе аплаты. Так, ужо 18 ліпеня 1941 г. бургамістр г. Брэста выдае распараджэнне аб звальненні «усіх асоб яўрэйскай нацыянальнасці, а таксама яўрэйскага паходжання, працуючых у якасці канторскіх работнікаў, памочнікаў пры вярбоўцы насельніцтва на работы па навядзенню парадку на тэрыторыі горада Брэста, а таксама *служачых нізавога звяна* (выдзелена ў дакуменце)» [10, с. 222]. А распараджэннем ад 17 верасня 1941 г. «усе яўрэі, працуючыя на камунальных і дзяржаўных работах, павінны адзін дзень

у тыдзень працавць бясплатна….дырэктары прадпрыемстваў…пры састаўленні плацёжных ведамасцей павінны помніць аб тым, што яўрэі атрымліваюць толькі 80 % ставак, якія ўстаноўлены для арыйскіх работнікаў» [10, с. 226].

Асаблівай старонкай у гісторыі паўсядзённага жыцця насельніцтва на акупаванай тэрыторыі Беларусі з'яўляецца ўзаемаадносіны жыхароў і партызан. У пачатку 1990-х гг. у дадзеная праблема знайшла адлюстраванне ў газетных і часопісных артыкулах. Неабходна адзначыць, што новыя падыходы ў асвятленні гісторыі партызанскай барацьбы выклікалі неадназначную рэакцыю айчынных навукоўцаў і грамадскасці. Так, напрыклад, як толькі прафесар Я. Шыраеў у артыкуле «Партызаны правакавалі акупантаў» выказаў меркаванне аб тым, што «…метады партызан часам нічым не адрозніваліся ад метадаў нямецкіх карных атрадаў… Не ашчаджалі яны і сялян, якія адмаўляліся аддаць партызанам свае небагатыя пажыткі. Не будзе памылкай сказаць, што ўсё гэта мела масавы характар» [11, с. 11], адразу ў абарону аднаго з асноўных тэзісаў савецкай гістарыяграфіі выступілі іншыя беларускія навукоўцы.

Прафесару Я. Шыраеву адказаў прафесар М. Крукоўскі, які ў артыкуле «Партызаны, партызаны – беларускія сыны», у прыватнасці, піша: «…Існавалі і сумна вядомыя асобыя аддзелы, якія праводзілі свае брудныя карныя аперацыі на мясцовым насельніцтве, выклікаючы ў нас глухое незадавальненне. Прыходзілася і нам, на жаль, удзельнічаць у баях са сваімі, г.зн. паліцаямі, уласаўцамі і інш.». Але разам з тым аўтар падкрэслівае, што «на Беларусі тады разгарнулася нечуванае па сваіх маштабах супраціўленне, перад якім меркне слава нават французскага Resistance… Гэта быў сапраўды ўсенародны, дарэчы, пераважна маладзёжны рух, і ён мог бы служыць выдатным узорам для сапраўды патрыятычнага выхавання нашай моладзі, а яго ваенны вопыт для належнай падрыхтоўкі» [12].

Аналагічнай думкі прытрымліваецца Н. Пашкевіч, які адзначае: «Я зусім не адмаўляю верагоднасць фактаў анархічнага самавольства партызан, нічым неапраўданых бясчынстваў і рэпрэсій з іх боку, пра якія гаворыць Я. Шыраеў, успамінаючы тагачасныя падзеі ў сваім родным раёне, а таксама спасылаючыся на некаторыя публікацыі ў друку… Адно толькі выклікае пярэчанне, – калі самаўпраўныя злачынныя дзеянні асобных людзей, колькі б іх ні было, уводзяць у ранг партызанскай палітыкі, стратэгіі і тактыкі» [13].

Праблема ўзаемаадносін партызан і мясцовага насельніцтва стала прадметам дыскусіі і ў навуковых выданнях. Большая частка даследчыкаў, крытыкуючы недахопы савецкіх гісторыкаў у асвятленні вылучанай праблемы, прытрымліваецца думкі, што нягледзячы на ўсе недахопы, негатыўныя факты, рух Супраціўлення абапіраўся на масавую падрымку мясцовых жыхароў. Разам з тым, як падкрэслівае Е. Я. Паўлава ў артыкуле «Многогранье всенародной борьбы. Отношения партизан с местным населением»: «Створаныя гітлераўцамі ўмовы пакідалі мясцоваму насельніцтву акупаваных тэрыторый няшмат варыянтаў: супрацоўнічаць з захопнікамі, ехаць остарбайтэрамі ў Нямеччыну або ісці ў лес да партызанаў. У дачыненні да грамадзян, якія чакалі, пазіцыя нацыстаў была жорсткай: альбо супрацоўніцтва з акупацыйнымі ўладамі, або

знішчэнне іх як прыхільнікаў савецкага ладу. Нацыянальным колам і мясцовай інтэлігенцыі нацысты таксама не асабліва давяралі… дакументы ўтрымліваюць прыклады як іх цеснага супрацоўніцтва, так і супрацьстаяння. Вайна абвастрыла праблемы і канфлікты, якія існавалі на працягу папярэдніх дзесяцігоддзяў і нават стагоддзяў. Поспехі народных мсціўцаў наўпрост залежалі ад падтрымкі мірнага насельніцтва. Большая частка канфліктаў мела лакальнае непалітычная паходжанне. Таму чым больш партызаны ўлічвалі законныя патрэбы і інтарэсы мясцовых жыхароў, тым больш значныя была іх падтрымка» [14, с. 84, 91].

Пра канфліктныя сітуацыі згадвае ў кандыдацкай дысертацыі К. А. Карчэўскі (знята аўтарам з абароны). Так, у Заходняй Беларусі яны былі выкліканы метадам загатоўкі прадуктаў харчавання для партызанскіх атрадаў і брыгад, трапна названага сялянамі «бамбёжкай». Паводле дадзенай сістэмы для забеспячэння харчаваннем за кожным атрадам камандаванне замацоўвала адну ці некалькі вёсак. У некаторых выпадках партызаны забіралі ў насельніцтва апошняе, нягледзячы на матэрыяльнае становішча сем'яў [15, с. 15].

Праведзены гісторыяграфічны аналіз сведчыць, што асвятленне праблем штодзённасці на акупаванай нацыстамі тэрыторыі Беларусі ў савецкі і беларускі перыяды мае свае асаблівасці. Савецкія гісторыкі разглядалі жыццё розных катэгорый як штодзённую бітву з ворагам. З распадам Савецкага Саюза і набыццём рэспублікай незалежнасці гісторыкі атрымалі магчымасць перагледзець многія моманты ў даследаваннях акупацыйнага рэжыму, у тым ліку і праблему паўсядзённага жыцця сельскага і гарадскога насельніцтва ў перыяд ваеннага ліхалецця. Звярнулі ўвагу гісторыкі і на праблему ўзаемаадносін жыхароў і партызан. Матэрыялы, якія ўтрымліваюцца ў працах беларускіх даследчыкаў, дазваляюць сцвярджаць, што палітыка акупацыйных уладаў характарызавалася антыгуманным падыходам да выкарыстання чалавечага рэсурсу на захопленай тэрыторыі. З прычыны гэтага рабочыя і сяляне вымушаны былі існаваць у вельмі цяжкіх умовах, пастаянна залежаць ад самавольства ўладаў. Штодзённае жыццё чалавека ва ўмовах акупацыі шмат у чым набыла характар выжывання.

## ЛІТАРАТУРА

1. *Залескі, А. І.* Быт беларускіх сялян у партызанскім краі / А. І. Залескі. – Мінск : Беларусь, 1960. – 210 с.

2. *Залесский, А. И.* В партизанских краях и зонах: патриотический подвиг советского крестьянства в тылу врага (1941–1944 гг.) / А. И. Залесский. – М. : Соцэкгиз, 1962. – 397 с.

3. *Залесский, А. И.* Советский патриотизм крестьянства в услових немецко-фашистской оккупации Белоруссии (1941–1944 гг.) : автореф. дис. … д-ра ист. наук : 07.00.02 / А. И. Залесский ; АОН АН БССР. – Минск, 1963. – 59 с.

4. Беларусь в годы Великой Отечественной войны : 1941–1945 гг. / А. А. Коваленя (рук. авт. кол.) [и др.]. – Минск : БелТА, 2005. – 544 с.

5. *Гребень, Е. А.* Гражданское население Беларуси в условиях немецкой оккупации (1941–1944 гг.) : монография / Е.А. Гребень. – Минск : БГАТУ, 2016. – 496 с.

6. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2000–2006. – Т. 5 : Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.]. – 2006. – 613 с.

7. *Шыбека, З.* Нарыс гісторыі Беларусі / З. Шыбека. – Мінск : Энцыклапедыкс, 2003. – 490 с.

8. *Туронак, Ю.* Беларусь пад нямецкай акупацыяй : пер. з пол. / Ю. Туронак ; кам. А.М. Літвіна. – Мінск : Беларусь, 1993. – 236 с.

9. *К'яры, Б.* Штодзённасць за лініяй фронту: акупацыя, калабарацыя і супраціў у Беларусі (1941–1944 гг.) : пер. з ням. / Б. К'яры ; навук. рэд. Г. Сагановіч. – 2-е выд., папраўл. – Мінск : Беларус. гіст. агляд, 2008. – 390 с.

10. Брест в 1941–1944 гг. Оккупация. Документы и материалы / Учрежд. «Государственный архив Брестской области»; сост. Г.Д. Калустова [и др.]. – Брест Альтернатива, 2016. – 316 с.

11. *Шыраеў, Я.* Партызаны правакавалі акупантаў / Я. Шыраеў // ЛіМ. – 1992. – 3 крас. – С. 10, 11.

12. *Крукоўскі, М.* Партызаны, партызаны – беларускія сыны / М. Крукоўскі // Літ. і мастацтва. – 1994. – 24 чэрв. – С. 5, 12.

13. *Пашкевіч, Н.* На арэлях разбэрсанай думкі / Н. Пашкевіч // ЛіМ. – 1992. – 3 крас. – С. 10, 12.

14. *Павлова, Е.* Многогранье всенародной борьбы. Отношения партизан с местным населением / Е. Павлова // Беларуская думка.– 2014. – № 2. – С. 82– 91.

15. *Карчевский, К. А.* Взаимодействие партизан и населения Беларуси в Великой Отечественной войне (1941–1944 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.03 / К. А. Карчевский ; Белорус. гос. ун-т. – Минск, 2003. – 20 с.